*Гэта – вечная праблема літаратуры, мастацтва. І вечная памылка мастацтва, якое выраджаецца, – ісці наперад праз адпрацоўку таго, з чаго дух гісторыі выпарыўся»* [2, с. 36]; і яшчэ раз – вобразна: «*"Тытанік" наскочыў на айсберг (амаль наскочыў), а яны ірвуцца туды, куды не паспелі, упусцілі. Дзіўная псіхалогія*» [2, с. 48]. Трэба разумець: на думку А.Адамовіча, для сучаснай літаратуры, найперш беларускай, багдановічаўская ідэя пра абавязковы «паўтарыцельны курс», пра неабходнасць для літаратуры засваення-паўтарэння мастацкіх узораў мінулага, па вялікім рахунку, састарэла. Сапраўды, ва ўсім свеце расце цікавасць якраз да актуальнага і «непрыдуманага» мастацтва – найперш у прозе, у драматургіі. І якраз эпічныя хронікі чырвонай утопіі С.Алексіевіч варта прызнаць узорам Адамовічавай «звышлітаратуры».

Такім чынам, працытаваныя вышэй канцэптуальныя тэзісы Алеся Адамовіча, апублікаваныя дачкой пісьменніка, даюць нам ключ да самых актуальных пытанняў эстэтыкі і паэтыкі, што адлюстраваліся найперш у творчасці самога Алеся Адамовіча, Васіля Быкава, а таксама іх паслядоўніцы Святланы Алексіевіч, уганараванай Нобелеўскай прэміяй – першай для Беларусі.

**Літаратура**


1. Адамовіч, А. «Браму скарбаў сваіх адчыняю...»: Даследаванне жыцця і творчасці М.Гарэцкага / А.Адамовіч. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1980. – 223 с.;
2. Адамовіч, А. З «зялёнага сшытка» (1987) / Публікацыя Наталлі Адамовіч // Крыніца. – 2000. – № 1 (58). – С. 28 – 81.
3. Адамовіч А. Камароўская хроніка - творчая гісторыя, жанр // Гарэцкі М. Збор твораў: У 4-х т. Т. 4. - С. 310-331.
4. Алексиевич, С. «Мои книги – не коллекция ужасов» [Электронный ресурс] / С. Алексиевич. – Режим доступа: www.lustrum.com.ua/svetlana_aleksievich Дата доступа: 07.04.2016.
5. Алексиевич, С. Нобелевская лекция [Электронный ресурс] / The Nobel Prize in Literature 2015 Svetlana Alexievich http://www.nobelprize.org/nobel_prizes/literature/laureates/2015/alexievich-lecture_ry.html Дата доступа: 07.12.2015.
6. ІгнатІв Н. Е. ЖанровІ пошуки художньоі документалістики 1970-90-х рр.// Автореферат дис. ... канд. філолог. наук. – Дніпропетровськ , 1998. – 18 с.
7. Палиевский, П.В. Документ в современной литературе // П.В.Палиевский. Литература и теория. – М.: Сов. Россия, 1979. – С. 128 – 173.
8. Тычына М. А. Алесь Адамовіч // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя. У 4-х т. Т. 4. Кн. 1. 1966-1985 / НАН Беларусі, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы. - Мн.: Беларуская навука, 2001. - С. 319-343.



**L. D. Sinkova**
Belarusian State University
e-mail: ldsinkova06@mail.ru


**"Super-literature" as Ales Adamovich's Idea and Sviatlana Aleksiyevich's Practice**


*Keywords: Belarusian prose, super-literature, documentary, artistic, extreme reality, cry aesthetics.*



*The article analyzes records "From "the green notebook"" by Ales Adamovich, they view the idea of "super-literature". The article proves that Sviatlana Aleksiyevich embodies the idea of "super-literature" practically. She created new epos: chronicles "Voices of Utopia", 2007 – 2008 (Nobel Prize for Literature, 2015).*



**З.І. Траццяк**
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
e-mail: zoya.tretyak@rambler.ru



УДК 821.161.3


## МАСТАЦКАЕ ЎВАСАБЛЕННЕ КРЫЗІСУ АКСІЯЛАГІЧНЫХ УСТАНОВАК У БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПРА ПЕРШУЮ СУСВЕТНУЮ ВАЙНУ


*Ключавыя словы: Першая сусветная вайна, беларуская літаратура, каштоўнасныя арыентацыі, нацыянальная самасвядомасць.*



*Артыкул прысвечаны разгляду беларускай літаратуры, якая ў 20-30-я гг. XX ст. увасобіла новыя аксіялагічныя устаноўкі, народжаныя Першай сусветнай вайной і рэвалюцыяй 1917 г. Даследуецца канцэптуальная тэндэнцыя: аповед пра знішчэнне высокага статусу асобы, яе прыпадабненне да міззэрнага механізму.*


Першая сусветная вайна – падзея, што змяніла сістэму каштоўнасцей у кожнай з краін-удзельніц. Паводле К.Свасьяна, «... калі дапушчальна выкарыстаць у дачыненні да гісторыі паняцце інфаркту, то дзень гэты [01.08.1914 г. – З.Т.] варта было б назваць шырокім інфарктам папярэдняй Еўропы ... Раптам ... распалася сувязь часу, і пачалося новае стагоддзе, "звіхнутая пара"...» [1, с.9]. Яго наступствы – войны і рэвалюцыі – адчулі на сабе і нашы продкі.

Трансфармацыі закранулі сутнасць узброенага канфлікту: «разлічаны стрэл спрактыкаванага снайпера, прыцельны гарматны агонь разам з захапленнем двубою саступілі месца неразборлівай кулямётнай чарзе і сканцэнтраваным артылерыйскім ударам» [2, с.45]. Каштоўнасць жыцця




Репозиторий ВГУ

зводзілася да мінімуму, а малюнкі біблейскага апакаліпсісу спраўджваліся на вачах. Гэта адзін з зыходных пунктаў, якія ў 20 – 30-я гг. XX ст. улічвала беларуская літаратурная супольнасць (П.Броўка, З.Бядуля, А.Гародня, М.Гарэцкі, Я.Колас, К.Крапіва, Я.Купала, М.Мялешка, Э.Самуйлёнак, К.Чорны і інш.), спрабуючы ўсвядоміць, як сусветная вайна паўплывала на іх суайчыннікаў.

Узброеныя канфлікты, якія вялі суседзі, «пракочваліся па Беларусі і яе народу. І шведская, і з Напалеонам, і ўсе войны з немцамі» [3, с.445]. Разам з праявамі нацыянальнага ўціску, іншымі грамадскімі працэсамі, яны змянялі ўяўленні чалавека пра ролю і месца ў свеце, адносіны з іншымі этнасамі. Войны суправаджаліся рознай па часе, інтэнсіўнасці і скіраванасці акупацыяй беларускіх тэрыторый.

Новыя павевы жніўня 1914 г. адбіліся на мастацтве слова. Паэзія (асабліва ў час вайны) аператыўна рэагавала на змены. Я.Купала ў паэме «Песні вайны» (1914) актуалізаваў вобразы, вядомыя па летапісах, «Слову пра паход Ігаравы» і беларускім фальклоры. У раздзеле «Варожбы» чытаем пра хмары ад пажарышчаў, хвалі пошасці, камету, сонечнае зацьменне, пра гругана, нячысціка, начніцы [4, с.210–211]. Кожны вобраз меў негатыўную афарбоўку, спрадвеку вядомую шараговаму чалавеку. З другога боку, згадкі пра самалёткі-арліхі, што супрацьстаялі кракадзіламгарматам (верш «Арліхі», 1914, З.Бядулі [5, с. 89–91]), выклікалі здзіўленне і цікавасць, якія перараджаліся ў жах і адмаўленне. Бядулевы напрацоўкі сведчылі пра тэндэнцыю да пошукаў парадаксальных вобразаў, якія б адпавядалі новым каштоўнасным арыентацыям.

А.Адамовіч, разважаючы пра «Камароўскую хроніку» М.Гарэцкага, падкрэсліў, што «ў першым “сшытку” ... людзі паміраюць, як жывуць: па-сялянску проста ... Такія смерці ўключаны ў спрадвечную плынь жыцця, аб іх апавядаецца і помніцца побач з клопатамі пра надвор’е, ураджай, ацёл, вяселле, хрысціны ...» [6, с.179]. Назіранні актуальныя для вывучэння твораў іншых беларускіх мастакоў слова. У мірны час земляробчы цыкл арганізоўваў быццё працаўніка, які забываўся на ірацыянальнасць долі, назіраючы за стваральным пафасам прыроды. Пачатак вайны сігналізаваў надыход этапу, калі веды пра акаляючае асяроддзе, звыклыя віды дзейнасці, чалавечыя адносіны і стаўленне да сябе праходзілі выпрабаванне. Былыя сяляне спасцігалі новыя каштоўнасці: формулу «што чалавек, што чарвяк» [7, с.576], аксіёмы, што забойства ворага – варты ўчынак, а вайсковыя статуты – аналаг біблейскіх запаветаў, ідэал працы – «старанна страляць, калоць, падпальваць, нішчыць, руйнаваць» [8, с.25].

Падзеі на фронце вымушалі разважаць пра сутнасць гераізму, які да вайны здаваўся бясспрэчнай каштоўнасцю. Пазней «наставаў такі момант, калі любы салдат мог зрабіцца героем: дастаткова было знайсці ў сабе крышку мужнасці, усхапіцца наверх, закрычаць “ура” і кінуцца ўперад ...» [9, с.60]. У папярэднім урыўку М.Лобан згадваў рэшткі мужнасці, якія вымушалі яго персанажаў дзейнічаць. М.Гарэцкі разгледзеў выпадкі разбурэння асобы. У кнізе «На імперыялістычнай вайне» ўражвае згадка пра «“праўдзівых герояў” – падпрапаршчыка X. і старшага феерверкера Z., якія пасылалі па розных справах пад кулі ніжніх чыноў, а самі “рабілі” ў акопе і закапвалі лапатачкамі» [10, с.72]. У падобным кантэксце змяняліся і адносіны вайскоўца да падзякі за варты ўчынак. Ва ўмовах, калі практыка ўзнагароджання закранула знясіленых жахамі вайны людзей, набыла выпадковы характар, станоўчай рэакцыі на медаль ці ордэн не прадбачылася.

Айчынныя празаікі, разважаючы пра мізэрны статус асобы, не кіраваліся прапагандысцкімі лозунгамі, якія будавалі мур варожасці паміж прадстаўнікамі розных нацый. Э.Самуйлёнак падаў галоўнага персанажа апавядання «Герой нацыі» як біялагічную адзінку, што змянілася пад уплывам франтавога вопыту: «Поўзаў Франц Штанге ... А калі ўставаў на ногі, то стаяў так няўмела, так няпэўна, як-бы гэта быў не чалавек, а чацвераногая істота, што ў сілу біялагічных законаў толькі вось цяпер, праз тысячагоддзі, наважылася стаць на дзве нагі ...» [11, с.108]. Заўвага трагічная, бо ў мінулым пратаганіст-немец захапляўся музыкай, граў на флейце, займаўся ва ўніверсітэце. Яго «перараджэнне» ўвасобіла тыповы і незалежны ад індывідуальных асаблівасцяў вопыт чалавека ў антыгуманных абставінах.

Бессэнсоўным станавілася жыццё цывільнага. Яго знішчалі / выпрабоўвалі не толькі кулі, бамбёжка, ці атрутныя рэчывы, а голад («Віленскія камунары» М.Гарэцкага), непамерная праца («Сокі цаліны» Ц.Гартнага), казацкія пагромы («Набліжэнне» З.Бядулі), зняважлівае стаўленне акупантаў («Літоўскі хутарок» М.Гарэцкага). Згубным здавалася вымушанае выгнанне: «Уцякацкая сям’я старалася выбрацца на абочыну дарогі і прымаць сваю чорную долю ў чыстым полі сярод чужых людзей, а найчасцей бяз іх. Колы і рэшткі набытку пястрэлі паабапал гасьцінцу; кожны дзень паўз яго вырасталі новыя магілы з крыжамі, і бяз іх; небаракі клаліся парыць зямлю пад енкі і сьлёзы сваіх родных пакутнікаў, а праз некалькі часу ... тыя самыя, што плакалі нядаўна, хаваючы свайго блізкага, самі разьвітваліся з жыццём на гэтым-жа самым гасьцінцы, адно што па іх ня было ўжо каму плакаць. Магілы паабапал гасьцінца дзірванелі шпарка ...» [12, с.48]. Вайна знішчыла таямніцу смерці, не пакінуўшы асобе права на годнае месца апошняга спачыну. Тыя персанажы, што заставаліся жыць,

Рэпазіторый ВДУ

пасля некалькіх сустрэч з рэшткамі чалавека забываліся на агіду, і адчувалі абыякавасць. У памежных умовах тэма смерці набывала трагічнае гучанне, калі дзейная асоба разважала пра ўласную магчымасць сысці ў нябыт, забойства блізкіх, сяброў, асобных таварышаў па службе.

Звыродствам станавілася ідэя нараджэння новага жыцця (гісторыі Монці з «Літоўскага хутарка» і Юзі з «Віленскіх камунараў» М.Гарэцкага). Сям'я страціла функцыю захавання каштоўнасцей (творы З.Бядулі, М.Гарэцкага), бо яе функцыянаванне парушалася чужынцамі, адносіны парываліся з нагоды мабілізацыі і вымушанага перасялення. Вопыт, набыты у акопах, перашкаджаў салдату падпарадкоўвацца патрыярхальным нормам, якія выглядалі як анахранізм (аповесць «Дзве душы» М.Гарэцкага).

Назіранні за бойняй вымагалі перагледзець адносіны да хрысціянства, дагматы якога ўкараніліся ў народнай свядомасці. У апавяданні Э.Самуйлёнка «Герой нацыі» адзначалася: «Бог носіць супроцьгаз і кідае бомбы вагой у пяцьсот кілограм страшнай выбуховай сілы ... Бог дзікуноў скончыў акадэмію генеральнага штабу па класу паветранай бамбардыроўкі і перакваліфікаваў святых» [11, с.121]. Здавалася, што толькі так тлумачылася атмасфера татальнага разбурэння, якая ўсталявалася па ўсёй Еўропе. Слова божае не асацыявалася з разумным і гуманным светаўпарадкаваннем.

Прапаганда спрабавала адрадзіць спагадлівае стаўленне да воінаў. Сапраўдныя пачуцці хаваліся за псеўдахрысціянскай сімпатыяй і паказным клопатам пра параненых, вонкавым шанаваннем забітых. У трэцяй квадры рамана «Сокі цаліны» Ц.Гартны сведчыў: «з герояў і абаронцаў раненыя рабіліся назолаю, лішніцай. Той, хто ... апяваў іхнія адважныя ўчынкі, у трамваі злаваўся і мармытаў лаянкі, што яму недзе сесці з-за абрубкаў людскога мяса» [13, с.190]. Страты на фронце не перашкаджалі мірным грамадзянам захапляцца гневам у дачыненні да ворага. Пакалечаныя вайной ветэраны наноў спасцігалі жыццё, знаходзячы простыя рэчы, якія мелі большы сэнс, чым прыгожыя словы ў прапагандысцкіх лозунгах (георгіеўскі кавалер Перагуд з паэмы «1914» П.Броўкі; сляпы ветэран Антось з аповесці «Набліжэнне» З.Бядулі). Асаблівай каштоўнасцю станавілася магчымасць кантактаваць з людзьмі, тым больш, што персанаж-інвалід вырываўся са звыклай плыні даваеннага жыцця і нават франтавога існавання, да якога ён паспеў прызвычаіцца.

Мастакі слова (М.Гарэцкі «Жартаўлівы Пісарэвіч», «Палонны»; З.Бядуля «Набліжэнне») заўважалі, што бежанства патрабавала ад персанажаў адаптавацца да абставін і каштоўнасцяў мясцовага насельніцтва, што ставіла знак тоеснасці паміж уцекачом і злодзеям. Беларус здагадваўся, што людзі з імперскай глыбінкі ўспрымалі яго як дзіва, абражаючы пытаннямі кшталту: «Хрышчоныя? Бараду носіце? Сурдут новы? Гаворка людская?» [7, с.563]. Калі канструктыўны дыялог не адбываўся персанаж чуў абвінавачванні: «Каб вас паралюш разбіў! Басурманы! Ідалы! Нехрысці!» [7, с.555]. У настолькі неспрыяльных умовах адарваным ад радзімы беларусам было складана захаваць традыцыі, звычаі і мову. За клопатам пра выжыванне яны не паспявалі перадаць наступнаму пакаленню, што знаходзілася пад моцным асімілятыўным уплывам, думку пра іх нацыянальную выбітнасць.

Вайна нараджала новыя каштоўнасці. Карысная здавалася адаптыўнасць (і ў цывільных, і ў вайскоўцаў). Напрыклад, пані з апавядання «Крывавы вір» Я.Коласа, пакутуючы на пачатку рэвалюцыі ад новага грамадскага ўпарадкавання, «думала аб немцах, думала аб іх ваяцкай выдатнасці. Калісь, ня вельмі даўно, яна шчыра жадала ім усякага ліха, лічыла іх разбойнікамі, катамі, ворагамі чалавецтва, якіх трэба зьнішчыць, пасадзіць на жалезны ланцуг. А цяпер гэтыя "каты" ёй здаваліся збавіцелямі, і яна прасіла бога ў патайных мысьлях сваіх, каб яны, гэтыя немцы, хутчэй прышлі сюды ...» [14, с.42]. Адсутнасць (запозненае развіццё) гэтай актуальнай якасці прыводзіла да негатыўных наступстваў. Радыкальным падаецца выпадак з Рускім (з аднайменнага апавядання М.Гарэцкага). Не здолеўшы падпарадкавацца франтавым памежным умовам жыцця, ён спазнаў горыч псіхічнага захворавання.

Люты 1917 г. адзначыў надыход яшчэ адной эпохі, што адразу пачала фарміраваць іншыя каштоўнасныя арыентацыі. Пісьменнікі заўважалі некаторую пераемнасць: у 1914 г. і 1917 г. высокі статус індывіда толькі пастуляваўся, але ўвасабленне гэтай ідэі ў жыцці не вытрымлівала крытыкі.

**Літаратура**


1. Свасьян, К. Освальд Шпенглер и его реквием по Западу / К. Свасьян // О. Шпенглер Закат Европы. Очерки морфологии мировой истории. Гештальт и действительность. – М. : Мысль, 1993. – С. 5 – 122.
2. Юнгер, Э. Лейтенант Штурм / Э. Юнгер // Рискующее сердце / пер. с немецкого, составление, вступительная статья и комментарии В.Б. Микушевича. – СПб. : Владимир Даль, 2010. – С. 39 – 104.
3. Адамовіч, А. Тварам да Апакаліпсіса / А. Адамовіч // Выбраныя творы. – Мінск : Кнігазбор, 2012. – С. 445 – 455.
4. Купала, Я. Песні вайны / Я. Купала // Збор твораў: у 9 т. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1997. – Т. 3: Вершы, пераклады 1911 – 1914. – С. 210 – 218.
5. Бядуля, З. Арліхі / З. Бядуля // Збор твораў: у 5 т. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1985. – Т. 1: Вершы і паэмы. – С. 89 – 91.




Репозиторий ВГУ

6. Адамовіч, А. «Браму скарбаў сваіх адчыняю ...» / А. Адамовіч. – Мінск : Выдавецтва БДУ, 1980. – 224 с.
7. Гарэцкі, М. Жартаўлівы Пісарэвіч / М. Гарэцкі // Выбраныя творы. – Мінск : Кнігазбор, 2009. – С. 553 – 576.
8. Гародня, А. У поплавах: Апавяданьне / А. Гародня // Маладняк. – 1927. – № 7 – 8. – С. 23 – 35.
9. Лобан, М. На парозе будучыні / М. Лобан // Выбраныя творы. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – С. 21 – 328.
10. Гарэцкі, М. На імперыялістычнай вайне (Запіскі салдата 2-й батарэі N-скай артылерыйскай брыгады Лявона Задумы) / М.Гарэцкі // Збор твораў: у 4 т. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1985. – Т.3. – С. 5 – 128.
11. Самуйлёнак, Э. Герой нацыі / Э. Самуйлёнак // Дачка эскадрона: апавяданні. – Мінск : ДВБ, Мастацкая літаратура, 1937. – С. 92 – 136.
12. Чорны, К. Бацкаўшчына / К. Чорны. – Менск : ДВБ ЛіМ, 1932. – 156 с.
13. Гартны, Ц. Сокі цаліны / Ц. Гартны // Збор твораў: у 4 т. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. – Т.3: Раман. – С. 5 – 506.
14. Гушча, Т. Крывавы вір / Т. Гушча // На рубяжы. – Менск : Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1925. – С. 36 – 55.

**Z.I. Tratsiak**
Polotsk State University
e-mail: zoya.tretyak@rambler.ru

**Fictional Depiction of Axiologic Crisis in Belarusian Literature about World War I**

*Key words: World War I, Belarusian literature, value orientations, national identity*

*The article is devoted to the study of Belarusian literature which in the 1920-30s depicted new axiologic orientations born by World War I and the revolution. A conceptual tendency is studied. That is the creation of a fictional story about the ruin of a special status of a personality compared to a tiny mechanism.*

**А.В. Шаколо**
Витебский государственный университет имени П.М. Машерова
e-mail: aleksasch-94@yandex.by

УДК 821.112.2

## ЦЕННОСТНЫЕ ОРИЕНТАЦИИ В СКАЗКАХ БРАТЬЕВ ГРИММ

*Ключевые слова: ценности, сказки, братья Гримм, принципы, мораль.*

*В статье рассматриваются ценностные ориентации сказок, записанных братьями Гримм; подтверждается факт их актуальности в настоящее время; проведено сопоставление ключевых персонажей с позиции воплощения ими разного рода ценностей (антиценностей); обозначен спектр ценностей, отражающий общие тенденции сказочного дискурса в аксиологическом плане.*

Сказки народов мира, как правило, обладают направленностью на конкретные идеалы, ценности, душевные качества своих персонажей. На примере сказок, записанных братьями Гримм, можно с уверенностью говорить об изображении в них таких ценностей, как справедливость, доброта, миролюбие, любовь, ненасилие [5]. Рассмотрим непосредственно сказочные тексты, чтобы определить, какую роль играют те или иные ценности (а также антиценности) в записанных и обработанных Я. и В.Гримм немецких народных сказках.

В сказке «Чудаковатый музыкант» („Der wunderliche Spielmann“) заглавный герой, оказавшись в лесу, где «время тянется медленно», вначале испытывает чувство единения с природой: «Он взял свою скрипку и заиграл на весь лес» [2, с.33]. Музыкант, казалось бы, как человек искусства, наслаждается гармонией с миром и собой на лоне природы, вдали от городской суеты. Он желает найти здесь товарища, однако на его пути встречаются только дикие звери (волк, лиса, заяц). Очарованные музыкой, те просят главного героя научить их играть так же, однако тот в ответ поступает вовсе не как хороший учитель: зажимает лапу волку, «помогает» лисе повиснуть на ветвях двух деревьев и оставляет привязанным зайца. В итоге музыкант все же встречает человека: местный дровосек наслаждается игрой скрипки и защищает незадачливого персонажа от гнева освободившихся животных.

В данной сказке главный герой изображен довольно неоднозначно, несмотря на то, что, как правило, сказочный дискурс предусматривает четкое разделение на черное и белое. С одной стороны, музыкант любит свое дело, ищет родственную душу, друга, воплощает возвышенность искусства, учитывая тот факт, что даже животные желали бы овладеть подобным мастерством. С другой же стороны, угроза в этой ситуации исходит вовсе не от леса, что было бы вполне ожидаемо, но от самого музыканта. Животные не проявляли никакой агрессии, однако он всех, в том числе и абсолютно безобидного зайца, наказывает, цинично обещая освободить позднее. В подобном контексте не совсем понятно, чего иного, кроме гнева, можно ожидать, поступив так с кем бы то ни было. Следовательно, эпитет «чудаковатый» использован в названии отнюдь не случайно: человек идет в лес, но раздражен тем, что встречает в качестве почитателей своего таланта не людей, а животных. Параллель с тенденциями современного общества напрашивается сама собой:

Репозиторий ВГУ